жр 3172

07
249

Бібліятэка АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

Прачытаў — перадай другому

# НАРОДНЫ МСЦІВЕЦ

Орган Слуцкага РК КП(б)Б

№ 20(72) | нядзеля, 7 мая | 1944 года.

> „НЕАБХОДНА ЗНІШЧЫЦЬ НЯМЕЦКІХ АКУПАНТАЎ ДА АДЗІНАГА, ЯКІЯ ПРАБРАЛІСЯ НА НАШУ РАДЗІМУ, ДЛЯ ЯЕ ЗАНЯВОЛЕННЯ."
>
> І. СТАЛІН.

## Наносіць сакрушальныя ўдары па ворагу

Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Савецкага Саюза таварыш Сталін у сваім першамайскім загадзе падвёў вынікі бліскучых перамог Чырвонай Арміі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гераічная Чырвоная Армія прайшла з баямі ад Волгі да Серета, ад прадгор'я Каўказа да Карпат, выйграла гістарычную бітву за Днепр і Правабярэжную Украіну, зламала магутныя абаронныя ўмацаванні немцаў пад Ленінградам і ў Крыму, перамагла вельмі сур'ёзныя водныя перашкоды і абарону немцаў на Паўднёвым Бугу, Днестры, Прут, Серет.

„У рэзультаце паспяховага наступлення Чырвоная Армія вышла на нашы дзяржаўныя граніцы на працягу больш 400 кіламетраў, вызваліўшы ад нямецка-фашысцкага гнёта больш трох чацвертых акупіраванай савецкай зямлі. Справа заключаецца цяпер у тым, каб ачысціць ад фашысцкіх захопнікаў УСЮ нашу зямлю і аднавіць дзяржаўныя граніцы Савецкага Саюза па ўсёй лініі фронта ад Чорнага мора да Барэнцавага мора." (І. Сталін)

Ранены нямецкі звер — гітлераўскія разбойнікі — цягнуцца ў сваё логава — праклятую Германію. Але ранены звер прадаўжае быць небяспечным.

„Каб пазбавіць нашу краіну і саюзныя з намі краіны ад небяспекі занявольвання, — піша ў сваім загадзе таварыш Сталін, — трэба праследаваць раненага нямецкага звера па пятам і дабіць яго ў яго ўласным бярлогу"

Баявая задача партызан і партызанак дапамагчы Чырвонай Арміі хутчэй вызваліць нашу зямлю ад гітлераўскіх людаедаў і дабіць нямецкага звера, Трэба кожны дзень, кожную мінуту, усюды, дзе толькі ходзяць нямецкія валацугі, знішчаць іх, не даваць ім спакою, трымаць іх у стане штодзённага напружання. выматваць з іх сілы, а нельга чакаць „зручнага" моманту, каб сустрэцца з немцамі і завязаць з імі бой.

Кожны камандзір, камісар партызанскага атрада, кожны партызан і партызанка павінны намятаць, што адсіжыванне і чаканне роўна здрадзе. Праступна перад Радзімай, перад народам адсіжывацца, калі нямецкія душагубы твораць крывавыя расправы над нашымі бацькамі, маткамі, сёстрамі, братамі, дзецьмі, руйнуюць нашы гарады і вёскі, увозяць наша багацце ў Нямеччыну. Трэба узначаліць баявую дзейнасць народных мсціўцаў, накіраваць на штодзённую і бязлітасную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, каб наносіць сакрушальныя удары па тылу ворага!

## Выпуск новаи пазыкі

4 мая г. г. выпушчана Трэцяя Дзяржаўчая Ваенная пазыка на суму 25 мільярдаў рублёў.

## Весткі з фронта

На фронце нічога істотнага не адбылося. За два дні 3 і 4 мая падбіта і знішчана 82 нямецкіх танкі, у паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 98 самалётаў праціўніка

У ноч на 4 мая буйныя сілы нашай авіяцыі бамбардыравалі нямецка-румынскія войскі, артылерыйскія пазіцыі і ваенныя склады праціўніка ў раёне Севастопаля.

## За граніцай

* На працягу красавіка англійская бамбардыровачная авіяцыя скінула на германскія ваенныя аб'екты 33000 тон бомб

* Амерыканская авіяцыя, якая дзейнічае ў Еўропе з аэрадромаў Англіі. скінула на Германію 24.000 тон бомб. За час налётаў амерыканскія лётчыкі знішчылі ў паветраных баях 800 германскіх самалётаў і 700 самалётаў на зямлі.

* Амерыканскія падводныя лодкі патапілі ў Ціхім акіяне 12 японскіх суднаў, у тым ліку два транспартных, крэйсер, 2 эсміаносцы і адзін буйны танкер.

* У Парыжы пануе фашысцкі тэрор. На працягу красавіка фашысты зрабілі 2.895 арыштаў.

* Ноччу 3 мая авіяцыя саюзнікаў зрабіла налёт на ваенныя аб'екты ў Бухарэсце. Другія злучэнні бамбардыравалі ваенныя аб'екты праціўніка ў Італіі і Югаславіі.

жср 3172



# Вывучаюць загад таварыша Сталіна

У партызанскай брыгадзе імені Чкалава арганізавана глыбокае вывучэнне першамайскага загада №70 Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна. Партызаны і партызанкі з вялікім жаданнем вывучаюць загад правадыра, у якім з усёй яскравасцю адлюстраваны гістарычныя перамогі Чырвонай Арміі і пастаўлены дальнейшыя задачы ў справе хутчэйшага ачышчэння ўсёй нашай зямлі ад лютага ворага.

У партызанскіх атрадах брыгады праведзены семінары з агітатарамі, на якіх дэталёва вывучан сталінскі загад. Агітатары праводзяць заняткі сярод партызан па вывучэнню загада. Адпраўлены групы агітатараў для вывучэння загада сярод працоўных зоны дзейнасці атрадаў.

Вывучэнне сталінскага загада партызаны і партызанкі адзначаюць актывізацыяй баявых дзеянняў, узмацненнем udараў па камунікацыях нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

# Дзень большэвіцкага друку

Штогод 5 мая адзначаецца дзень большэвіцкага друку. У гэты дзень у 1912 годзе ў Петраградзе вышаў першы нумар газеты „Правда". Яна з'явілася магутнай зброяй у руках большэвіцкай партыі.

„Друк—адзіная зброя, пры дапамозе якога, партыя што дзённа, штогадзінна гаворыць з рабочым класам на сваёй, патрэбнай яму мове. Другіх сродкаў працягнуць духоўныя ніці паміж партыяй і класам другога такога гібкага апарата ў прыродзе няма." (СТАЛІН)

Большэвіцкі друк рос не па днях, а па гадзінах. Праз яго партыя няcла і нясе большэвіцкае слова праўды ў масы. У дні царызма, ў дні змагання за Совецкую ўладу Комуністычная партыя праз большэвіцкі друк паднімала рабочых і сялян на барацьбу з ворагамі, на заваяванне свайго шчасця і свабоды.

Вялікую роль адыграў большэвіцкі друк у дні мірнага совецкага жыцця. Наш друк на сваіх старонках асвятляў поспехі совецкіх людзей і мабілізоваў на паспяховае вырашэнне стаячых задач.

Зараз у дні Айчыннай вайны большэвіцкі друк упісаў слаўную старонку ў гераічную барацьбу совецкага народа з нямецкімі захопнікамі. Магутнай зброяй з'явіўся падпольны большэвіцкі друк. Ў тылу ворага выходзяць сотні газет, журналаў, лістовак. Праз падпольны друк партыя расказвае працоўным акупіраванай тэрыторыі праўду аб жыцці Совецкага Саюза, аб паспяховым наступленні Чырвонай Арміі, аб міжнародным становішчы, падымае совецкіх людзей, папаўшых пад нямецкі гнёт, на актыўную вызваленчую барацьбу з гітлераўскімі разбойнікамі, расказвае аб баявых справах народных мсціўцаў.

Дзень большэвіцкага друку наша газета адзначае гадавінай свайго існавання. У цяжкіх умовах падполля газета выходзіць регулярна. За гэты час выпушчана 83.150 экземпляраў газет і лістовак. Гэта з'явілася магутным ударам па ворагу. Газета заслужана карыстаецца павагай сярод працоўных Случчыны. Яна сыграла вялікую роль у справе разгортвання партызанскага руху на Случчыне.

Большэвіцкі друк, які вырашчаны Леніным і Сталіным, быў, ёсць і будзе магутнай зброяй у руках нашай партыі у барацьбе за чэсць, свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

# Натхнёны загадам правадыра

Гістарычны загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна падняў партызан нашага атрада на новыя баявыя подвігі. Партызаны і партызанкі аднадушна заявілі, што яны не пашкадуюць ні сіл, ні жыцця для хутчэйшай перамогі над ворагам, абавязаліся дапоўніць бліскучыя перамогі Чырвонай Арміі партызанскімі ўдарамі па нямецка-фашысцкіх захопніках.

Свае абавязацельствы народныя мсціўцы ператвараюць у канкрэтныя справы. Нядаўна партызан-славак Міхаіл К. і партызан-случчачін Дзмітрый Р. прабраліся да варожай чыгункі на ўчастку Слуцк—Урэчча і замініравалі яе. Ішоўшы эшалон наскочыў на міну. Ад узрыва разбіты паравоз, 2 вагоны і 3 вагоны пашкоджаны. На другую ноч партызаны прабраліся ў горад Слуцк. На электрастанцыі стаяў паравоз, падрыхтаваны для адпраўкі ў далейшы шлях. Адважныя партызаны надклалі пад паравоз узрыўчатку і ўзарвалі яго.

Партызан Леанід М. са сваімі таварышамі сістэматычна мініруе дарогу паміж двумя нямецкімі гарнізонамі, па якой ездзяць гітлераўцы. На адной міне ўзарвана 4 немцы, на другой — аўтамашына і 7 немцаў. Трэцюю міну Леанід паставіў у 100 метрах ад нямецкага паста. Ад узрыва міны знішчаны павозка з боепрыпасамі і ехаўшыя на ёй гітлераўцы.

Натхнёныя Сталінскім загадам, мы будзем з дня ў дзень павышаць сваю баявую дзейнасць.

ПЁТР С.
Камандзір атрада ім. Громава

Адказны рэдактар—
РЭДКАЛЕГІЯ

Выданне Слуцкага РК КП(б)Б